**Кісялёў** Аляксей Аляксеевіч // Полацкі веснік. — 1996. — 5 ліп. — С. 4.

На 51 годзе жыцця трагічна загінуў старшы інспектар штаба грамадзянскай абароны горада, старшыня савета ветэранаў Афганістана, падпалкоўнік запасу Кісялёў Аляксей Аляксеевіч.

Усё свае свядомае жыццё ён прысвяціў служэнню Радзіме ў радах Узброеных Сіл. Выхаванец Калінінскага сувораўскага вучылшча, ён прайшоў шлях ад курсанта Кіеўскага ВАКВ да старшага памочніка начальніка аператыўнага аддзялення дывізіі.

Двойчы выконваў інтэрнацыянальны абавязак, спачатку у Сірыі, потым з мая 1987 года па люты 1989 года ў Рэспубліцы Афганістан.

За мужнасць і гераізм узнагароджаны двума ардэнамі Чырвонай Зоркі, медалём за Баявыя заслугі і дзесяццю іншымі медалямі.

Калі выйшаў у запас, працаваў у штабе грамадзянскай абароны горада, стаяў ля вытокау стварэння Полацкай гарадской арганізацыі ветэранаў Афганістана.

Яго адрознівала прынцыповасць, дабрыня, выключная працавітасць, шчырасць і добрасумленнасць.

Светлая памяць пра чалавека вялікай душы і высокіх маральных ідэалаў назаўседы застанецца з тым, хто ведаў яго і працавау разам з ім.

**Калектывы штабоў ГА**
**Віцебскай вобласці і г. Полацка**

**Арганізацыя ветэранаў Афганістана Віцебскай вобласці і г. Полацка**